# АБАГУЛЬНЯЛЬНАЕ ПАЎТАРЭННЕ ПА РАЗДЗЕЛЕ III

***Праверым свае веды.***

1. Галіновая структура сусветнай гаспадаркі — гэта…
2. Аўтсорсінг — гэта…
3. Міжнародны геаграфічны падзел працы — гэта…
4. Парытэт пакупной здольнасці — гэта…
5. Транснацыянальная карпарацыя — гэта…
6. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя — гэта…
7. Альтэрнатыўная энергетыка — гэта…
8. Лічбавая эканоміка — гэта…
9. Крыптавалюта — гэта…
10. Якія прычыны і падзеі спрыялі фарміраванню сусветнай гаспадаркі?
11. Якія галіны ўваходзяць у першасны, другасны, трацічны сектары эканомікі?
12. Якімі найноўшымі зменамі характарызуецца міжнародны геаграфічны падзел працы?
13. Назавіце вядучыя эканамічныя інтэграцыйныя аб'яднанні ў свеце.
14. Якую ролю ў сусветнай эканоміцы адыгрываюць ТНК?
15. Якія геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі існуюць?
16. Які ўплыў аказала НТР на развіццё прамысловасці?
17. Якія адрозненні існуюць паміж сектарам паслуг развітых краін і краін, якія развіваюцца?
18. Чаму існуюць станоўчыя і адмоўныя бакі ТНК?
19. Чаму інтэграцыйныя працэсы ахопліваюць усе сферы дзейнасці чалавечага грамадства?
20. Чаму ў цяперашні час актыўна выкарыстоўваюцца найноўшыя спосабы вырошчвання раслін?
21. Чаму ў хімічнай прамысловасці і машынабудаванні часцей за ўсё ўкараняюцца навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія распрацоўкі?
22. Чаму павялічваюцца выдаткі на развіццё фармацэўтычнай прамысловасці?
23. Чаму ў свеце хуткімі тэмпамі растуць аб'ёмы вытворчасці харчовай і лёгкай прамысловасці, а доля гэтых галін у структуры апрацоўчай прамысловасці свету скарачаецца?
24. Чаму турысцкая галіна панесла найбольшыя страты ад пандэміі COVID-19?
25. Чаму крытэрыем развіцця сектара ІКТ з'яўляецца выкарыстанне інтэрнэту?

### Папрацуем з атласам.

1. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па аб'ёмах валавога збору пшаніцы; кукурузы; рысу.
2. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па пагалоўі буйной рагатай жывёлы; свіней; авечак.
3. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па здабычы нафты; прыроднага газу; вугалю.
4. Пакажыце на карце тры галоўныя краіны — вытворцы электраэнергіі.
5. Пакажыце на карце тры найбуйнейшыя АЭС свету; ГЭС свету.
6. Пакажыце на карце тры галоўныя краіны-вытворцы: сонечнай энергіі; ветравой энергіі; геатэрмальнай энергіі.
7. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны-вытворцы: чыгуну; сталі; першаснага алюмінію; рафінаванай медзі; рафінаванага цынку; рафінаванага свінцу.
8. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны-вытворцы: марскіх суднаў; легкавых аўтамабіляў; станкоў.
9. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны-вытворцы: калійных угнаенняў; азотных угнаенняў; фосфарных угнаенняў; хімічных валокнаў; швейнай прадукцыі.
10. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па аб'ёме імпарту паслуг; экспарту паслуг.
11. Пакажыце на карце тры вядучыя марскія порты па грузаабароце.
12. Пакажыце на карце тры вядучыя аэрапорты свету па пасажыраабароце.
13. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па колькасці турысцкіх прыбыццяў.
14. Пакажыце на карце тры найбуйнейшыя фінансавыя цэнтры свету.
15. Пакажыце на карце тры вядучыя краіны па развіцці сектара ІКТ.

### Прагназуем.

1. Якія змены адбудуцца ў структуры сусветнай гаспадаркі ў бліжэйшыя 50 гадоў?
2. Якія новыя галіны прамысловасці могуць з'явіцца ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі?
3. Якія праблемы, на ваш погляд, могуць абвастрыцца ў сувязі з узмацненнем глабалізацыі?
4. Як зменіцца энергетычны баланс у бліжэйшыя 50 гадоў?
5. Як магчыма вырашыць харчовую праблему насельніцтва Зямлі?
6. Ці ёсць будучыня ў электронных грошай?
7. Як ІКТ змогуць змяніць жыццё людзей у найбліжэйшай будучыні?